ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 83 | ПАНЯДЗЕЛАК, 10 КРАСАВІКА 1933 г. | № 83

НЕ ЗАПАЛОХАЮЦЬ.

Не толькі ангельская дыплёматыя атрымала ведамленьне аб арышце групы ангельскіх інжынэраў у СССР, зарэз-жа была пушчана ў ход уся сыстэма пагроз і застрашваньняў. Ня ведаючы яшчэ, у чым абвінавачваюцца арыштаваныя, ня ведаючы, на чым грунтуецца абвінавачваньне, ангельская дыплёматыя лічыла маўчаньнем выступіць са сьмехатворным тэзісам аб немагчымасьці іх віноўнасьці. Яна адразу выкінула трэбаваньне аб вызваленьні абвінавачаных, аб адмове ад суду над імі. Буржуазна-ангельская газэта «Манчэсьцер гардыян» піша 31 сакавіка з поваду гэтых трэбаваньняў: «Якое-б та ні было наша перакананьне ў бязвіннасьці арыштаваных, як-бы мы ні падавалі матывы і мэтады прасьледваньня, немагчыма абараняць прынцып, па якім брытанскі грамадзянін ў Расіі наздольны парушыць расійскія законы. Мы не дапусьцілі б такога прынцыпу ў адносінах чужаземцаў у нашай краіне, як-бы высока мы ні паважалі іх нацыю, і мы ня можам чакаць, што гэты прынцып будзе кім-небудзь прыняты. Ні ў Расіі, ні ў якой-небудзь іншай краіне, з якой мы знаёмімся ў роўнапраўных адносінах, мы ня можем трэбаваць пераваг накшталт дапушчэньня суд ангельскіх адвакатаў, бо і мы не зрабілі такіх уступак чужаземцам. Бескарысна трэбаваць ад незалежнай сучаснай дзяржавы, каб яна адмовілася ад абвінавачваньня, калі самі падобныя трэбаваньні, прад'яўленыя нам, лічылі-б афронтам, які прымусіў-бы нас пагадзіцца на нашу палітыку ўсякай цаной. Усё гэта ўяўляе зьбітае месца міжнароднай палітыкі".

Мы ня будзем паўтараць і абгрунтоўваць гэты зьбітыя месцы. Савецкі ўрад даў на дыпляматычныя пагрозы дастойны адказ, заявіўшы, што суд адбудзецца і што Савецкі саюз не дазволіць нікому ўжываць у адносінах да сябе мэты, што дазваляюць сабе імпэрыялістычныя краіны ў дачыненьні да калёній, карыстаючыся іх безабаронасьцю. Пераканаўшыся, што савецкі ўрад ня ўступіць пад націскам дыплёматычных пагроз і шалёнства ангельскага імпэрыялістычнага друку, ангельскія імпэрыялісты рашылі ўзмацніць пагрозы, канкрэтызуючы іх. Рашэньне ангельскага парляманту, прынятае наўпрэкі пратэсту дэпутатаў лейбарыцкай партыі і прадастаўляючае ўраду поўнамоцтвы забараніць у выпадку неабходнасьці ўвоз савецкіх тавараў пасьля 18 красавіка (17 красавіка канчаецца тэрмін гандлёвага дагавору) уяўляе сабою пагрозу матар'яльнай страты Савецкаму саюзу, калі ён не падпарадкуецца вымаганьням ангельскага імпэрыялізму. Прадсэдацель ангельскага ўраду і частка ангельскай прэсы спрабуюць замаскаваць характар гэтай пагрозы, заяўляючы аб сваёй надзеі, што гэты мерапрыемствы ня прыдзецца ўжыць, і заўважаючы, што справа тут ідзе аб пасяганьні на права савецкага ўраду прыцягваць да судовай адказнасьці парушаючых савецкія законы. Гэтыя спробы не затушуюць становішча. Яно ў наяўнасьці, што ад савецкага ўраду патрабуюць адмовы ад прыцягненьня да суду людзей, якіх ён лічыць вінаватымі, пагражаючы ў праціўным выпадку матар'яльнымі стратамі. Патэнцыял гэтага рашэньня памыляцца ў сваіх разьліках. Рабочая кляса і сялянства Савецкага саюзу не для таго скінулі ўладу рускіх памешчыкаў і капіталістаў, каб дазваляць гаспадарыць на савецкай тэрыторыі чужаземным капіталістам, не для таго, каб дазваляць чужаземным імпэрыялістычным урэдам дыктаваць волю Краіне саветаў.

Такога роду пагрозы з боку ангельскіх імпэрыялістаў нямінуча навотяць на пытаньне, чаму яны так стараюцца. Мабыць, яны ведаюць больш аб гэтай справе, чым вядома грамадзкай думцы іх краіны, мабыць, яны баяцца, што суд выявіць такія бакі, аб якіх яшчэ ня ведома.

Ва ўсякім разе, гэтыя пагрозы кідаюць яснае сьвятло на характар зьнешняй палітыкі ангельскага імпэрыялізму. Ангельскі ўрад належыць да ініцыятараў скліканьня міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі, задача якой — намеціць сродкі для ажыўленьня сусьветнай гаспадаркі. «Адлавіцелі» сусьветнай гаспадаркі даюць найлепшы прыклад зруйнаваньня міжнародных эканамічных сувязяй. Яны матывуюць сваю пагрозу савецка ангельскаму гандлю сьцьвярджэньнем, што нельга весьці гандлёвыя справы пры адсутнасьці вядомых юрыдычных гарантый. Але гэты аргумэнт б'е іменна па іх, бо яны дамагаюцца, каб Савецкі саюз адмовіўся ад судовага сьледзтва і судовага прысуду, і каб ён вызваляў людзей, якіх лічыць вінаватымі ў парушэньні сваіх законаў. Калі хто і ўправе гаварыць аб зруйнаваньні ўмоў міжнароднага гандлю, то іменна наша краіна, якая можа прад'явіць гэта абвінавачваньне ангельскаму імпэрыялізму. Ніякі сур'ёзны гандаль немагчымы, калі пануючая кляса Англіі будзе дазваляць сабе прыбягаць да пагроз разарваньня гандлёвых вносін з прычыны ініцыятыў, якія магчымы заўсёды, калі справа ідзе аб раёце чужаземцаў на чужой ім тэрыторыі, а тым больш, калі справа ідзе аб эканамічных адносінах розных сацыяльных сыстэм. Звычайны факт, што Савецкі саюз мае справу з тысячамі чужаземных інжынэраў і што прыходзіцца прыбягаць да судовых дзеяньняў толькі ў выключных выпадках, паказвае, што тут і гутаркі ня можа быць аб злой волі з савецкага боку. Прыбяганьне ў такім выпадку да пагроз з боку ангельскіх імпэрыялістаў паказвае, як сур'ёзна адносяцца гэтыя паны да стварэньня ўмоў для ажыўленьня міжнародных эканамічных вносін.

Паны ангельскія імпэрыялісты выступаюць у ролі міжнародных міратворцаў. Яны вучаць другія краіны, як трэба шукаць мірнага вырашэньня канфліктаў, як трэба нават падвяргаць рэвізіі дагавары, якія выклікаюць нездавальненьне другіх нацый. Адначасова ангельскія імпэрыялісты пагражаюць на справе эканамічным байкотам вялікай краіне ня з поваду парушэньня міжнародных дагавароў, а з поваду дастасаваньня законаў гэтай краіны супроць людзей, якіх яна абвінавачвае ў злачынстве.

Неадпаведнасьць прадмету канфлікту і мерапрыемстваў ангельскага імпэрыялізму настолькі ярка, настолькі відаецца ў вочы, што паўстае пытаньне аб больш глыбокіх прычынах, выклікаўшых такія паводзіны ангельскага імпэрыялізму. Мы яшчэ зьвернемся да гэтых прычын у далейшым. Сёньня мы толькі кажам, што не ангельскія міністры будуць рашаць, як павінны дастасоўвацца законы ў Савецкім саюзе: гэта рашае і будзе рашаць урад Савецкага саюзу. Колькі-б ні пагражалі ангельскія імпэрыялісты, іх пагрозы ня будуць мець ніякага ўплыву на савецкі суд. Савецкі суд будзе судзіць выключна на надставе матар'ялаў сьледзтва аб віноўнасьці ці бязьвіннасьці абвінавачваемых і вынясе той прыгавор, які патрабуе савецкі закон. Адзіны вынік пагроз ангельскіх імпэрыялістаў будзе састаяць у тым, што рабочая кляса і сялянства Савецкага саюзу яшчэ раз убачаць, чаго варты мірныя запэўніваньні і дружалюбныя словы ангельскай дыплёматыі. Ангельскія імпэрыялісты прадэманстравалі яшчэ раз, што яны не адмовіліся ад жаданьня камандваць і загадваць на савецкай тэрыторыі. Гэта запомняць народныя масы Савецкага саюзу. Ангельскі ўрад і парлямант ангельскага імпэрыялізму выказаліся. Цяпер чарга за савецкім судом. Ён неабуральна вынясе свой прысуд.

Хто-ж больш пацерпіць ад ажыцьцяўленьня пагроз—Англія ці Савецкі саюз—пакажа будучыня.

(Перадавы артыкул «Известий»).

БІЛЛЬ (ЗАКОНАПРАЕКТ) АБ ЗАБАРОНЕ САВЕЦКАГА ІМПАРТУ Ў АНГЛІЮ.

ЛЁНДАН, 4. Агенцтва „Рэйтэр" паведамляе: Білль аб забароне імпорту рускіх тавараў у Англію сёньня Ідэнам (таварышам міністра замежных спраў) у палату абшчын. Першае чытаньне адбылося бяз спрэчак. Першы артыкул дае права забараняць шляхам дэкрэту імпорт у Англію якіх-бы та ні было тавараў, зробленых ці пераапрацаваных у СССР, ці якой-небудзь катэгорыі ці намэнклятуры падобных тавараў, дакладна паказаных у дэкрэце.

Другі артыкул білля датычыцца правіл дадастаўленьня ліцэнзій.

Трэці артыкул датычыцца выпадкаў невыконаньня кантрактаў у рэзультаце дэкрэту, прадугледжваемага артыкулам першым.

Чацьвёрты і апошні артыкул устанаўляе, што білль набывае моц 18 красавіка.

* * *

Як паведамляе агенцтва «Рэйтэр», перад другім чытаньнем законапраекту Саймон закрануў падзеі, што зьвязаны з справай кампаніі Метропалітэн-Вікерс". Ён запытаўся: ці жадае палата, каб урад нічога не прадпрымаў і межаваўся-б толькі ветлівымі запытаньнямі, трымліваючыся ад якіх-небудзь другіх крокаў. Далей, паказваючы на манаполію зьнешняга гандлю ў СССР, Саймон заявіў: Брытанскі ўрад зараз просіць палату абшчын у інтэрэсах гэтых людзей і ў інтэрэсах перакананьня савецкага ўраду ў сур'ёзнасьці становішча прадаставіць яму тое права, якім у часны момант распалагае савецкі ўрад.

У заключэньне Саймон прасіў палату прадставіць ураду поўнамоцтвы і даручыць яму скарыстаць іх, калі больш нічога нельга зрабіць для аказаньня дапамогі брытанскім грамадзянам, што знаходзяцца ў небясьпецы.

Лейбарыст Стаффорд Крыбс заявіў, што апублікаваная перапіска паміж Овіем і ангельскім ўрадам ня ўтрымлівае выстарчальных падстаў для трэбаваньня аб вызваленьні служачых «Мэтропалітэн-Вікерс» бяз суду і прымаць рэпрэсыўныя меры супроць савецкага ўраду. Крыбс лічыць, што заключэньне пасьля 13 сакавіка аб тым, што вядомыя асобы не вінаваты, было надта пасьпешным. Няма нічога такога, што дало-б права міністру заявіць аб тым, што брытанскі ўрад перакананы ў бязьвіннасьці нашых грамадзян.

Сьледам за гэтым выступіў Кірквуд (лейбарыст), які заявіў, што брытанскі ўрад запэўніваў, што ён імкнецца да міру, хай жа ён зараз гэта дакажа. Незалежны Мэкстон заявіў, што агульны дух выступленьняў за апошнія тыдні кажа аб тым, што значная колькасьць членаў палаты хочуць, каб вялікі экспэрымэнт рускага народу пацярпеў паражэньне. Лейбарыст Бэвін заявіў, што яго партыя вызьдзіўлена лёгкадумнай прамовай Сэмюэля і запытаўся ў яго, што павінен быў зрабіць, па думцы Сэмюэля, савецкі ўрад з арыштаванымі інжынэрамі. Ён казаў, што Літвінаў заняў адзіна магчымую пазыцыю, настойваючы на сувэрэнных правах СССР. Кансэрватар акругі, якая вядзе буйны гандаль з СССР, трэбаваў устанаўленьня гранічнага тэрміну дзеяньня законапраекту.

Ленсбэры лічыць, што за выраз, ужыты ангельскім паслом у Маскве, нясе адказнасьць ангельскі ўрад.

На пытаньне Сэмюэля міністр гандлю Рэнсімэн заявіў, што асноўная мэта законапраекту зьвязана з адносінамі да яго «соотечественников» у Расіі, што знаходзяцца ў сучасны момант пад арыштам.

Законапраект прыняты ў другім чытаньні большасьцю 347 галасоў супроць 48.

Папраўка аб абмежаваньні тэрміну дзеяньня білля, аб эмбарга (забароны) на савецкія тавары адным месяцам адхілена 306 галасамі супроць 40.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 83 | ПАНЯДЗЕЛАК, 10 КРАСАВІКА 1933 г. | № 83

Аб мабілізацыі рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прадпрыемстваў і транспарту.

ПАСТАНОВА БЮРО ГАРКОМУ КП(б)Б АД 7 КРАСАВІКА.

Бюро гаркому пастанаўляе:

1. На падставе дырэктывы ЦК УсеКП б) прапануецца ўсім партыйным, савецкім і грамадзкім арганізацыям спыніць усялякія мабілізацыі рабочых ад варштату на патрэбы бягучых кампаній.

2. Забараніць мабілізацыю рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прамыслова-ўцы і транспарту на пасеўную, транспартную і прапашную работы.

3. Да 12-га красавіка зьвярнуць на работу ўсіх ужо мабілізаваных таварышоў.

4. Адмяніць усе ранейшыя пастановы ГК, супярэчныя гэтай.

Сэкратар гаркому КП(б)Б МІЦЬКОЎ.

Веснавая сяўба і задачы КП(б)Б.

Рэзалюцыя сходу гарадзкога партактыву па дакладзе тав. Гікало.

1. Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад сэкратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО «Аб веснавой сяўбе і задачах КП(б)Б», актыў віцебскай партарганізацыі падкрэсьлівае надзвычай вялікую адказнасьць усёй КП(б)Б, а тым больш Віцебскай арганізацыі, як адной з буйнейшых у БССР, у правядзеньні севу 1933 году, у выкананьні дырэктыў партыі і ўраду, улічваючы, што вясна 1933 году вырашае справу бальшавізацыі калгасаў, ператварэньне ўсіх калгасьнікаў у заможных.

Партактыў лічыць, што рад практычных мерапрыемстваў—раньняя сяўба, мерапрыемствы па ўзьняцьці ўраджайнасьці, арганізацыя працы ў калгасах—будуць пасьпяхова ажыцьцяўлёны толькі тады, калі яны будуць праводзіцца на вялікім палітычным узроўні.

2. Партактыў падкрэсьлівае, што віцебская партарганізацыя да гэтага часу, нягледзячы на вурокі сяўбы і загатовак 1932 г., папярэджаньні і патрабаваньні ЦК партыі, усю войстрасьць пастановы пытаньня аб адказнасьці гарадзкіх партарганізацый за становішча вёскі—Віцебскі прыгарадны раён у справе разгортваньня сяўбы ня мае патрэбнага размаху і такіх паказчыкаў, якія-б забясьпечвалі вядучасьць раёну па БССР, ператварэньне прыгараднай сельскай гаспадаркі ва ўзорную.

Партактыў асабліва падкрэсьлівае глыбокае адставаньне па падрыхтоўцы да сяўбы прыгарадных гаспадарак (асабліва фабрыкі імя Цэткін, каапгасу «Парыская камуна»), нездавальняючае становішча калгаснага плянаваньня, асабліва па калгасных брыгадах, нездавальняючае становішча працоўнай дысцыпліны, усё працягваючаяся ігнараваньне жаночай сілы ў калгасах, найбольш рэзкае адставаньне ў выкананьні мерапрыемстваў па ўзьняцьці ўраджайнасьці.

Гэткае становішча магло атрымацца выключна таму, што большасьць Віцебскай партарганізацыі яшчэ ня ўцяміла сваёй адказнасьці за становішча сяла: ня выкарчаваны яшчэ саноўна-барскія адносіны да выкананьня важнейшых мерапрыемстваў па правядзеньні веснавой сяўбы, пытаньне шэфства і адказнасьці гораду за становішча вёскі ня выйшла яшчэ з рамак абяцаньняў і дэкларацыйнасьці, сельскія, партыйныя і савецкія арганізацыі вельмі павярхоўна падыходзяць да ацэнкі сапраўднага становішча, яны і работнікі гарэвморганаў, і спэцыялісты сельскай гаспадаркі, і трохкутнікі прадпрыемстваў не надышлі ўплатную да асобных дэталяў арганізацыі работы ў калгасах і каапгасах і, галоўным чынам, па частцы аказаньня калгасу, калгаснай брыгадзе і брыгадзіру канкрэтнай, практычнай дапамогі.

3. Партактыў патрабуе ад усёй партыйнай арганізацыі, ад гарЗА, МТС, ад кожнага гарадзкога і вясковага камуніста пастаноўкі сваёй работы так, каб зараз-жа на-ходу поўнасьцю ўлічыць і зьнішчыць недахопы па пачатку і разгортваньні сяўбы, улічваючы, што зараз ужо час спыніць разговоры аб падрыхтоўцы, бо раён уступае ў паласу сяўбы і што толькі максымальная мабільнасьць забясьпечыць раньнюю сяўбу, правядзеньне яе ў вызначаныя пленумам ЦК КП(б)Б тэрміны (12—15 дзён) і гэтым самым ганаровае пяршынства Віцебшчыны ў спаборніцтве з Менскім і Гомельскім раёнамі.

Актыў віцебскай партарганізацыі патрабуе ад усіх камуністаў і, у першую чаргу, ад работнікаў калгасна-зямельных органаў бальшавіцкай актывізацыі сваёй штодзённай дзейнасьці, павышэньня рэвалюцыйнай пільнасьці да шкодніцтва і вылазак недабітага яшчэ кулацтва, нацдэмаўскіх, прышчэпаўскіх, эсэраўскіх элемэнтаў, да малейшых спроб сарваць сяўбу, яе тэрміны, мерапрыемствы па ўзьняцьці ўраджайнасьці, да якіх бы та ні было размоў аб нерэальнасьці плянаў, бо гэтыя размовы і нават чуткі дэмабілізуюць работнікаў, рабочыя і калгасныя масы і тым самым робяць любы рэальны плян нерэальным і невыканальным.

Актыў лічыць, што рад прынятых ЦК УсеКП(б), КП(б)Б, яе ЦК, Савнаркомам, гаркомам рашэньняў па частцы правядзеньня сяўбы зьяўляюцца баявой праграмай работы і зараз справа не ў вынясеньні новых рэзалюцый, а ў праверцы іх выкананьня, у рэзкім узьняцьці палітычна-масавай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў і ў прыняцьні адміністрацыйных мер да той часткі аднаасобнікаў, якая разграцілася і пайшла ў спэкуляцыю.

4. Сход партактыву падкрэсьлівае, што ўзмацненьне ўвагі і кіраўніцтва вёскай лавінна праходзіць пры адначасовым рашучым узьняцьці работы ўсіх камуністаў і, у першую чаргу, гаспадарнікаў, партыйных і прафэсыянальных работнікаў па выкананьні прадпрыемствамі сваіх вытворчых праграм. Прарыў у выкананьні прамфінпляну большасьці прадпрыемстваў, зьяўляецца рэзультатам адсутнасьці бальшавіцкай барацьбы вытворчых арганізацый за поўную рэалізацыю шасьці паказаньняў тав. Сталіна, нездавальняючай пастаноўкі справы ахопу палітычным узьдзеяньнічаньнем і агітацыяй шырокіх мас рабочых, нерашучасьцю ў ачыстцы прадпрыемстваў ад распоўзшыхся па іх клясава-варожых элемэнтаў. Актыў абавязвае ўсе парткалектывы, ячэйкі, усіх камуністаў поўнасьцю выканаць пастанову ГК і ГКК ад 11-га студзеня. у першую чаргу ачысьціўшы фабрыкі і заводы ад кулацка-школьніцкіх элемэнтаў, замацоўваючы і скарыстоўваючы паўсюды лепшы вопыт работы перадавых прадпрыемстваў, набыты ў час правядзеньня кампаніі перазаключэньня калдагавароў.

Актыў падкрэсьлівае яўна нездавальняючае становішча з асваеньнем новых прадпрыемстваў, узьняцьцём прадукцыйнасьці працы і барацьбы за якасьць—цэнтральных задач 1933 году.

5. Сход актыву ад імя ўсёй Віцебскай партарганізацыі цалкам і поўнасьцю адабрае рашэньні ЦК, апошняга пленуму гаркому КП(б)Б, паказаньні ЦО УсеКП(б)—«Правды», ЦО КП(б)Б—„Зьвязды" па ажыцьцяўленьні і аб дапушчаных памылках у нацыянальным пытаньні. Актыў патрабуе ад кожнага камуніста сапраўднага баявога ажыцьцяўленьня гэтых рашэньняў. сапраўды актыўнай барацьбы за ліквідацыю самага глыбокага прарыву ў віцебскай арганізацыі, рашучага змаганьня на два франты—супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць ухілу ў бок мясцовага нацыяналізму, уздымаючы вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму.

6. Актыў, ад імя ўсёй віцебскай партарганізацыі, запэўнівае ЦК КП б)Б і тав. Гікало, што віцебская арганізацыя, яшчэ больш аддаючы ўвагі выкананьню партыйных і ўрадавых заданьняў па сельскай гаспадарцы, дабіецца вядучасьці раёну і поўнага выкананьня прызначанага пляну сяўбы на 1933 г.

Бальшавікі Віцебшчыны! Яшчэ больш згуртуем свае рады на барацьбу за генэральную лінію партыі, за народна-гаспадарчы плян першага году другой пяцігодкі, за яго важнейшае зьвяно—веснавую сяўбу!

Узорна, сапраўды па-бальшавіцку правядзем сяўбу, узначальваючы энтузыязм рабочых і калгасных мас Віцебшчыны, іх адданасьць справе партыі, справе пралетарскай дыктатуры!

ТРЫКУТНІКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НЯСУЦЬ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА СЯЎБУ Ў КААПГАСАХ.

Апартуністычны самацёк, благадушша, спадзяваньне на „авось"—вось, што губіць справу гародняй сяўбы

ПРАДПРЫЕМСТВЫ І КААПГАСЫ АБАВЯЗАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ ВЫВЕЗЬЦІ ГНОЙ І АБАВЯЗКОВА НА ПАЛІ КААПГАСАЎ.

Палі клічуць гаспадароў, а гаспадары не гатовы.

Мы ўжо некалькі разоў пісалі аб прарыве ў падрыхтоўцы да сяўбы па каапгасе імя Молатава. Між тым, прарыў і да гэтае пары не ліквідаваны. Гаспадарка да сяўбы не гатова.

Патрэбнай колькасьцю раньняй бульбы (50 тон) і позьняй (25 тон) гаспадарка не забясьпечана. Тое-ж самае і з насеньнем гародніх культур; не хапае значнай колькасьці моркві. Капусты раньняй і позьняй зусім няма. Плян вывазкі гною выканан толькі на 45 проц. 40 тон мінэральнага ўгнаеньня ляжыць у горадзе на складзе ЗРК. Цягавая сіла не падрыхтавана. Кармавы фонд ня створан. Рабочая сіла па брыгадах не разьбіта і не прымацавана да вытворчых вучасткаў. І зусім ганебна, калі трактары заводам „Чырвоны мэталіст" яшчэ і сёньня не адрамантаваны. Бульбакапалкі і сялкі стаяць у гразі. Па словах загадчыка гаспадаркі т. Адзінцова, яны лічацца спраўнымі, але ніхто не правяраў іх годнасьці з мінулага году.

Дысцыпліна сярод рабочых слабая. Гаспадарка ператварылася ў прахадны двор. За тры месяцы г. г. зволена 48 чал. і прынята 46 з агульнай колькасьці 80 рабочых.

Прыйшла пара выехаць на палявыя работы. Ужо на паасобных вучастках гаспадаркі глеба высахла і чакае апрацоўкі, а каапгас не падрыхтаваўся.

Кіраўніцтва заводу і каапгасу павінна прыняць энэргічныя меры і адхіліць пагрозу зрывам веснавой сяўбы. М.

„Шляпы" з каапгасу „Білева" і ЦРК згнаілі насеньне.

(Ліст рабочага каапгасу).

Сапраўднай работы па падрыхтоўцы да сяўбы ў каапгасе «Білева» не адчуваецца. Да гэтага часу рабочыя пляны ня складзены, да брыгад і паасобных рабочых не даведзены. Не хапае насеньня, а маючаеся насеньне канюшыны 180 кілёграм згніла. Пагніла шмат вікі і пачаў загравацца засыпаны тоўстым слоем гарох.

Уноў прызначаны дырэктар Ахрамейка днямі прасіджвае ў канцаляры, ня бачачы, што робіцца ў гаспадарцы. Кіраўніцтва з боку праўленьня ЦРК зусім адсутнічае. Калі да ўсяго гэтага дадаць, што цягавая сіла ў сваёй большасьці выбыла са строю, то стане зусім яскравым становішча гатоўнасьці да сяўбы.

Трэба не дапусьціць зрыву сяўбы ў каапгасе. Шкоднікаў у зьнішчэньні насенных фондаў трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Сяргей Жылінскі.

„Гаспадары" наводзяць... безгаспадарчасьць.

Прыгарадная гаспадарка шчоткамбінату да севу не падрыхтавана. З прычыны абязьлічкі, дрэннага корму і адсутнасьці ветэрынарнага нагляду некаторыя коні не работаюць на працягу поўгода. Калі з боку брыгадзіра Прусава былі спробы зьнішчыць недахопы, асабліва абязьлічку, то пам. загадчыка гаспадаркі Браткоў яму перашкаджаў, кажучы: «не твая справа».

Загадчык гаспадаркі Маладцоў нават ня ведае, у якой колькасьці і дзе ў гаспадарцы знаходзіцца сельска-гаспадарчы інвэнтар. Гора-гаспадарнікі да гэтага часу ня прынялі маёмасьці, значнай часткі якой не хапае, а астатняя раскідана па двары і іржавее.

А—д.

ХОД ЗАКЛАДКІ ПАРНІКОЎ ПА КААПГАСАХ ПА СТАНОВІШЧЫ НА 8-е КРАСАВІКА 1933 г.

(у штуках рам).

НАЗВА КААПГАСАЎ	Вызначана па пляне	Закладзена	Закладзена	Засеяна
Імя Молатава	500	455	350	200
Імя МОПР	200	235	235	100
„Церасполь"	1000	685	622	416
„Яноўка"	8000	7080	4040	2638
„Новы шлях"	250	250	234	74
„Тулава"	250	250	200	145
Імя Пар. камуны	1500	368	298	198
Шчоткамбінату	800	245	245	80
РАЗАМ	12000	9568	6224	3851

У каапгасе „МОПР" зрываецца закладка парнікоў.

Па пляне каапгас «МОПР» павінен быў закласьці 300 парніковых рам. Між тым, на 6 красавіка закладзена 235. Засеяна толькі 40. Слабыя тэмпы работы па засеве парнікоў тлумачацца несваечасовай падвозкай гарачага гною. Маецца яшчэ таксама і недахоп 65 рам і для іх няма шкла. М. П.

Пералом зроблен.

Узьнятыя тэмпы работы ў каапгасе імя Молатава стварылі пералом у закладцы і засеве парніковых рам. На 8 красавіка ашклёна 455 рам, закладзена 350 рам і засеяна 200.

Ёсьць упэўненасьць, што плян закладкі і засеву 500 парніковых рам будзе выканан да тэрміну. П.

ПРА ПЛЯН ЗДАЧЫ ЖЫТА ПА САВГАСАХ СЫСТЭМЫ ЎПАЎНАВАЖАНАГА НК САВГАСАЎ СССР ПРЫ СНК БССР І ПЛЯН ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА ПА ІНШЫХ САВГАСАХ БССР.

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

Выходзячы з пляну здачы жыта ў 1933 г., вызначанага Народным Камісарыятам Савгасаў СССР для трэстаў рэспубліканскага значэньня ў 11600 цэнтн. і пляну здачы збожжа па іншых савгасах (рэспубліканскіх, нетрэставаных, ведамственых і іншых савгасных гаспадаркаў), вызначанага Камзаг СНК СССР у 12300 цэнтнэраў, у тым ліку жыта 8200 цэнтн., Савет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Устанавіць наступны плян здачы збожжа паасобнымі трэстамі і арганізацыямі на 1933 г. (у цэнтнэрах);

НАЗВА АРГАНІЗАЦЫІ	Жывень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Усяго
1. Менскі Малпрамтрэст	705	1.645	1.880	470	4.700
2. Віцебскі „	270	630	720	180	1.800
3. Гомельскі „	600	1.400	1.600	400	4.000
4. Птушкатрусагадоўчы трэст	165	385	440	110	1.100
Разам па сыстэме НК Савгасаў	1.740	4.060	4.640	1.160	11.600
5. Садгародтрэст	260	800	920	650	2 630
6. Белдзяржплутрэст	40	140	160	100	440
7. Савг. «Х годз. БССР»	25	75	90	60	250
8. Бульбян ст. НКЗ БССР	30	35	—	—	65
9. Сельгасп. сэкцыя Белкаапсаюзу	290	870	1.000	740	2.900
10. Лесасэкцыя Белкаапсаюзу	65	200	240	170	675
11. Торфасэкцыя Белкаапсаюзу	10	35	40	25	110
12. Наркамюст	25	75	90	65	225
13. Галоўміліцыя	20	50	60	40	170
14. Савгас камвузу «Вязынь-Фаніпаль»	10	30	35	15	90
15. Дасьледч ст. «Зазер'е» НКЗ БССР	20	65	75	50	200
16. Тураўская дасьледч станц. НКЗ	15	15	—	—	30
17. Балотная станцыя НКЗ	15	—	—	—	15
18. Белпушніна НКЗамежн. гандлю	20	60	75	45	200
19. Упаўнаркамлес	415	1.265	1.470	1.040	4.190
20. Галоўсацстрах (НКПрацы)	30	40	—	—	70
Разам па іншых савгасах	1.290	3.755	4.255	3.000	12 300

2. Абавязаць упаўнаважанага НК Савгасаў т. Жолудава ў сутачны тэрмін спусьціць гэты плян у трэсты, прапанаваўшы ім у трохдзённы тэрмін спусьціць плян кожнаму савгасу, фэрме, аддзяленьню з указаньнем тэрміну здачы.

3. Даручыць Упаўкамзаг СНК па БССР у аднадзённы тэрмін разьмеркаваць гэты плян па культурах і даслаць плян паказаным у арт. 1 гэтай пастановы арганізацыям, прапанаваўшы НК Земляробства, Белкаапсаюзу, Галоўміліцыі, упаўнаважанаму НК Леспраму, НК Працы і ўпаўнаважанаму НК Замежнага гандлю ў трохдзённы тэрмін спусьціць плян кожнаму савгасу з указаньнем тэрміну здачы.

4. Абавязаць упаўнаважанага НК Савгасаў, НК Земляробства, Белкаапсаюз, Галоўміліцыю, упаўнаважанага НК Леспраму, НК Працы, упаўнаважанага НК Замежнага гандлю падаць Упаўкамзаг СНК да 5 красавіка плян здачы збожжа ў савгасным разрэзе.

5. Папярэдзіць дырэктароў трэстаў, упаўнаважанага НК Савгасаў, НК Земляробства, Белкаапсаюз, Галоўміліцыю, упаўнаважанага НК Леспраму, НК Працы, упаўнаважанага НК Замежнага гандлю, што пры вызначэньні пляну здачы збожжа паасобным савгасам павінны быць улічаны ня толькі пасеўныя плошчы, але трэба падыйсьці канкрэтна да кожнага савгасу, улічыўшы адлегласьць яго ад месца здачы, становішча з рабочай сілай у часе ўборкі і г. д.

6. Забараніць дырэктарам савгасаў здаваць і прадаваць збожжа каму-б там ні было, апрача арганізацый, вызначаных плянам, і папярэдзіць іх, што ў выпадку парушэньня гэтага яны будуць прыцягвацца да судовай адказнасьці як за разбазарваньне дзяржаўнай маёмасьці

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед

Сэкратар ЦК КП(б)Б М. Гікало

СПАБОРНІЦТВА ТРОХ РАЁНАЎ: МЕНСК, ВІЦЕБСК, ГОМЕЛЬ.

Мацаваць вытворчую брыгаду— АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСЕ.

Плясуноў не падрыхтаваў сваёй брыгады.

Пробны выезд у поле паказаў, што калгас «Шчамілаўка», Замастоцкага сельсавету, у цэлым гатоў да сяўбы. Рамонт інвэнтару закончан цалкам. Якасьць рамонту добрая. Асабліва, што заслугоўвае ўвагі, гата калёсы—усе новыя, добра зробленыя і з добраякаснага матар'ялу. Вывезена 530 вазоў гною замест 500 вазоў па пляне. Збор попелу па пляне закончан.

Калі пробны выезд разглядаць з арганізацыйнага боку, то трэба адзначыць, што арганізацыі цяжка было і адшукаць. Пачалі рыхтавацца з 6-ці гадзін раніцы, а выезд быў у 12 гадзін дню. Праўда, тут віна і членаў пасеўкому, якія выезд прызначылі на 10 гадз. раніцы, а зьявіліся ў 12. Але-ж брыгадзіра, як арганізатара, гаспадара брыгады не адчувалася.

У калгасе арганізавана 2 вытворчых паляводчых брыгады Перавагу з іх трэба аддаць брыгадзе № 1 „Шчамілаўка". Тут быў добры выгляд каня, добрая ўпраж, хамуты, дугі, калёсы ўсе новыя, коні пачышчаны і г. д. Што датычыць другой брыгады—«П'яны мох», то там вусім адваротнае. Брыгадзір не адпавядаў свайму прызначэньню і тым вялікім запатрабаваньням, якія на брыгадзіра ўскладаюцца. Ён, брыгадзір Плясуноў Герасім, прыехаў на нязмазаных калёсах. Гайдашова Н. спазьнілася, яна прыехала ў 10 гадзін на кабыле «Ластачка» без аралейнага хамута. Чарнышоў Алесь прыехаў не на змазаных калёсах, атосы звальваліся. У Алеся дрэнны хамут, перавязаны вяровачкамі з вузялкамі, што, бязумоўна, у час работы можа нацерці шыю каню. Коні не пачышчаны, лахматыя.

Пасьля выезду агульны сход падвёў вынікі праверкі гатоўнасьці. Плясунова Герасіма тут-жа рашылі зьняць з работы брыгадзіра. Калгасьнікі абурыліся тым, што на чорную дошку былі занесены калгасьнікі ўдарнікі. На дошку занасіла Грабнёва М.—настаўніца-адказны рэдактар насьценгазэты. Грабнёва ня ўцямяла, што на чорную, альбо чырвоную дошку можа заносіць толькі праўленьне калгасу.

Сход пастанавіў арабіць дэталёвае расьсьледваньне гэтае справы і прасіць сельсавет прыцягнуць Грабнёву да адказнасьці, як за запясеньне на чорную дошку ўдарнікаў, так і за тое, што яна не працавала па складаньні вытворчых брыгадных плянаў.

Пасьля пробнага выезду выпушчана насьценгазэта.

Брыгада калгасьнікаў: Воранаў, Белякоў, Семянкоў І.

Брыгадзір Хапко дапамагае разбураць калгас.

Брыгадзір Хапко калгасу імя Чарвякова (Віцебскі сельсавет) прыкрывае шкодніцкаў і дапамагае ім раскрадваць калгасную маёмасьць і агітаваць за разбурэньне калгасу. Зьяўляючыся членам сельсавету, укрыў кулака Чарнічанка, браў вялікі хабар, захаваў у сябе 4 мяшкі кулацкага насеньня. У вёсцы Слабада ён браў хабар і арганізоўваў папойкі. Укрыў ад уліку 1,2 тоны калгаснага сена, сказаўшы, што яно пагніла. У яго брыгадзе маецца група кулакоў: Раманаў Восіп, былы рандатар, ня мае ніводнага працадня і хаваецца ў калгасе ад цьвёрдага заданьня. Хведчанка—сын кулака, які возіць крадзенае калгаснае сена, дапамагае Хапко ў яго шкодніцкай справе. Ён даў Хведчанку каня, каб прывезьці і адвезьці ў горад папа.

Праўленьне калгасу павінна ачысьціць калгас ад кулакоў і іх прыхільнікаў.

Зоркае вока.

Шамшура ня можа быць брыгадзірам.

Брыгадзір брыгады № 4 калгасу „Чырвоны ўсход" (Міхалёўскі сельсавет) Шамшура Алесь згнаіў 2 га ячменю, 2 га сена, шмат аўсянай кармавой саломы і бульбу. Гнілую і мёрзлую бульбу, каб замясьці сьляды, ён бяз ведама праўленьня раздаў калгасьнікам Гультаям, якіх у яго брыгадзе маецца значная колькасьць, за зробленую палову нормы ён запісваў па працадні, а то і больш. Шамшура быў западазроны ў пакражы аўсу, бульбы, але чамусьці гэтыя факты ня былі выкрыты канчаткова.

Ён самавольна ўшоў на прадпрыемства, падбухторыўшы да гэтага шмат калгасьнікаў і толькі калі пала яго карова, ён зьвярнуўся ў калгас і патрабаваў, каб яму далі карову, чаго і дабіўся.

Старшыня калгасу Дрындрожык пакрывае ўсе злачынствы Шамшуры, гэта ён настайваў на выдачы каровы Шамшуры.

Шамшура—дрэнны гаспадар, рвач і вор,—павінен быць неадкладна зьняты з работы брыгадзіра.

Калгасьнік.

УЧОРА НА ПАЛЁХ.

(ПА ПАВЕДАМЛЕНЬНЯХ НАШЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ, СЕЛЬКОРАЎ, СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І СЭКРАТАРОЎ ПАРТ'ЯЧЭЕК).

ЯЛАГІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЗАСЕЯЛІ 6 ГА КАНЮШЫНЫ.

Калгас імя Гамарніка прыступіў да сяўбы канюшыны. Сяўцы Мартыненка Я., Самароседка Ц і Ліаненка Ц, строга прытрымліваючыся нормы высеву, ударнымі тэмпамі засеялі 6 га.

Гэтымі днямі калгас прыступае да ворыва.

Селькор Балотнікаў.

ВІЦЕБСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПРЫСТУПІЛІ ДА ВОРЫВА, РАЗГОРТВАЕМ СЯЎБУ КАНЮШЫНЫ

Калгасы імя Чарвякова, «Іскра» і імя Чырвонай арміі разгортваюць работу па ворыве прасохшых палёў і прыступілі да сяўбы канюшыны. Сэкратар парт'ячэйкі Рыжы.

ДАЎЖАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

СПАБОРНІЧАЮЦЬ НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ.

Частка калгасаў сельсавету прыступіла да палівых работ. Калгас «Шлях Ільліча» засеяў 4 га канюшыны, забарановаў 3 га яблеваго ворыва, узараў 7 га. Калгас „Інтэрнацыянал" узараў 3 га і «Сілач»—1 га.

З выездам у поле разгарнулася сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне сяўбы. У калгасе «Шлях Ільліча» ўсе брыгады заключылі паміж сабой саццагаворы на пасьпяховае правядзеньне сяўбы. Калгас „Інтэрнацыянал" выклікаў на сацспаборніцтва калгас „Шлях Ільліча".

Сурганаў.

Праўленьне калгасу страціла клясавую пільнасьць.

Брыгадзірамі вытворчых брыгад могуць быць толькі лепшыя, праверэныя, добрасумленныя калгасьнікі. Але ў калгасе імя Калініна (Маскаўскі сельсавет) часта брыгадзірамі пападаюць клясавыя ворагі.

У Слабадзкой брыгадзе да гэтага часу быў брыгадзірам Шалуха Кузьма—вор, які раскрадаў яшчэ ў мінулым годзе каля 70 пудоў калгаснага збожжа, за гэта яго сёлета асудзілі на 3 гады. Праўленьне калгасу стала падшукваць брыгадзіра для гэтай брыгады і знайшло Шалуху Базыля. Аб прыёме ў калгас падаў заяву Шалуха Базыль. Ён у мінулым годзе быў вычышчан з калгасу за агітацыю супроць калгасу. Пры выхадзе з калгасу ён перш стаў разьбіраць абагуленую маёмасьць: ён узяў каня, карову, але за гэта пабыў некалькі тыдняў пад арыштам. Бацька яго—Шалуха Стахвая пазбаўлены права голасу, а ў сучасны момант за кулацкі сабатаж асуджаны з канфіскацыяй маёмасьці. Такі твар Шалухі. Нягледзячы на гэта, праўленьне калгасу пастанавіла прыняць у калгас клясавага ворага Шалуху Базыля і адразу-ж прызначыла яго брыгадзірам Слабадзкой брыгады. Праўленьне калгасу на чале са старшынёй «шляпай» камуністам Лядзенка Піліпам зусім страціла клясавую пільнасьць.

Машэра Ц.

За бальшавіцкае правядзеньне першай вясны другой пяцігодкі!

Дагавор сацспаборніцтва цэнтральнага, абласнога і раённага друку Беларускай ССР і Заходняй вобласьці.

На зьездах калгасьнікаў-ударнікаў БССР і Заходняй вобласьці заключан дагавор сацыялістычнага спаборніцтва на ўзорнае правядзеньне веснавой сяўбы.

Рэспубліканскі, раённы і нізавы сельскі друк Беларусі, абласны, раённы і нізавы друк Заходняй вобласьці ўключаюцца ў спаборніцтва і прымаюць на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Давесьці пастановы рэспубліканскага і абласнога зьезваў калгасьнікаў-ударнікаў аб спаборніцтве БССР і Заходняй вобласьці да кожнага калгасу і калгаснай брыгады.

2. Мабілізаваць рабселькораў, нізавы друк, ударнікаў-рабочых савгасаў, трактарыстаў, ударнікаў-калгасьнікаў, усіх рабочых савгасаў і калгасьнікаў на барацьбу за выкананьне пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК, 3-й сэсіі ЦВК СССР, вадовы ўсесаюзнага зьезду і пастановы рэспубліканскага і абласнога зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў пра ўмацаваньне калгасаў.

Мабілізаваць працоўныя масы вёскі на барацьбу за ўзорнае правядзеньне веснавой сяўбы, за высокадаходныя бальшавіцкія калгасы.

3. Па-бальшавіцку змагацца супроць клясавага ворага, шкодніцтваў і іх агентуры, выкрываць і змагацца супроць кулацкіх антыпільных настроў, за своечасовае і поўнае завяршэньне падрыхтоўкі да сяўбы на ўсіх вучастках, за раньнія ўшчыльнёныя тэрміны сяўбы, за выкананьне пасеўных плянаў і высокую якасьць усіх сельска-гаспадарчых работ, за сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў савгасах, МТС і калгасах, за выкананьне пляну сяўбы працоўнымі аднаасобнікамі.

У мэтах выкананьня гэтых абавязацельстваў друк Беларусі і Заходняй вобласьці абавязваецца правесьці наступныя практычныя мерапрыемствы:

1. Арганізаваць і правесьці заклік рабочых савгасаў, МТС, лепшых калгасьнікаў у рады ўдарнікаў бальшавіцкай сяўбы, а таксама заклік калгасьнікаў-ударнікаў у рады ўдарнікаў друку.

2. Умацаваць насьценныя газэты ў тых савгасах і калгасах, дзе яны ёсьць, арганізаваць нізавы друк у кожным з іх, а таксама разгарнуць сетку насьценных газэт у пастаянных брыгадах калгасаў. Выпусьціць з гэтай мэтай два макеты насьценных газэт калгасаў і насьценгазэт калгасных брыгад.

3. Правесьці да 15 красавіка ва ўсіх раёнах, савгасах, МТС і калгасах зьлёты і нарады рабселькораў, на якіх абмеркаваць задачы друку ў веснавой сяўбе і ва ўмацаваньні калгасаў.

4. На старонках друку весьці шырокае растлумачэньне значэньня адозвы ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і паказаць вопыт лепшых па яе выкананьні.

5. Арганізаваць выязныя рэдакцыі ў раёны, савгасы, МТС і калгасы.

6. Арганізаваць ва ўсіх раёнах пробныя выезды ў поле і агляды гатоўнасьці да сяўбы, агляды якасьці пасеўных работ, праверку правільнасьці арганізацыі працы.

7. Правесьці рэйды праверкі выкананьня пляну сяўбы (забесьпячэньне высокаякасным насеньнем, падрыхтоўка цягла, зямлі, веданьне брыгадамі сваіх задач, якасьць ворыва і сяўбы).

8. Вывучаць і паказваць вопыт лепшых калгасаў, лепшых калгасных вытворчых брыгад, а таксама выкананьне сваіх абавязацельстваў делегатамі абласнога і рэспубліканскага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў.

9. Апэрацыйна, штодзённа асьвятляць на старонках газэт падрыхтоўку да сяўбы і ход палівых работ (зводка, дзёньнік, агляд друку).

10. Арганізаваць папарнае спаборніцтва ўсіх раёнаў, савгасаў, МТС, калгасаў і вёсак на ўзорнае правядзеньне веснавой сяўбы і паказаць вопыт лепшых арганізатараў сацыялістычнага спаборніцтва.

11. Арганізаваць і правесьці агляд перабудовы шэфскай работы, і па лініі шэфскай работы арганізаваць пастаянную дапамогу рабкорам і селькорам.

12. Разгарнуць у друку агратэхнічную прапаганду і ўзначаліць работу па разгортваньні масавага аматарскага руху ў савгасах і калгасах у духу ўказаньняў ЦО „Правды".

13. Арганізаваць грамадзкія буксіры дапамогі адстаючым як у падрыхтоўцы да сяўбы, так і ў самой сяўбе.

14. Сыстэматычна даваць агляды раённых насьценных газэт па пытаньнях пасеўнай кампаніі і выкананьня данага дагавору-спаборніцтва.

Прэзыдыум абласнои нарады рэдактароў раённых газэт Заходняй вобласьці. Дэлегацыя друку БССР.

У ДАПАМОГУ СЕЛЬСКАЙ ПАРТ'ЯЧЭЙЦЫ.

ЯК АРГАНІЗАВАЦЬ ГАЗЭТУ Ў КАЛГАСНАЙ БРЫГАДЗЕ.

«Пастаянная брыгада павінна стаць цэнтрам палітычна-масавай і культурнай работы ў калгасе, таму ЦК і СНК прапануюць усім РК і РВК, сельпарт'ячэйкам і сельсаветам разгарнуць работу брыгадных вытворчых нарад, арганізаваць выхад брыгадных штодзённых газэт, асабліва ў час веснавой сяўбы.

Брыгадныя газэты павінны весьці рашучую барацьбу з лодырамі, прагульшчыкамі і шкодніцкамі і мабілізоўваць калгасьнікаў, на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва, на справу найбольш пасьпяховага і ўдарнага правядзеньня веснавой пасеўкампаніі», — так запісалі ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове «Пра вытворчую брыгаду».

Выданьне штодзённай газэты ў калгаснай вытворчай брыгадзе мае выключнае значэньне.

У гэтым невялічкім артыкуле мы і ставім задачу даць некаторыя інструкцыйна-мэтадычныя ўказаньні з тым, каб дапамагчы парт'ячэйцы арганізаваць штодзённую насьценную газэту ў калгаснай вытворчай брыгадзе.

Кожная калгасная або брыгадная насьценгазэта ўсёй сваёй апэрацыйна-масавай работай дапамагае парт'ячэйцы ў яе рабоце па далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу, па ўздыме ўраджайнасьці, па сацыялістычным перавыхаваньні калгасьнікаў.

Кожная газэта ў калгасе павінна быць забясьпечана выразным партыйным кіраўніцтвам. У кожнай парт'ячэйцы павінен быць сельпартарганізатар па друку, у задачу якога ўваходзіць работа з насьценгазэтамі і селькорамі.

З чаго пачаць арганізацыю газэты ў калгаснай брыгадзе?

Посьпех работы газэты ў калгаснай брыгадзе вырашае рэдкалегія. Таму перш-на-перш неабходна стварыць працаздольную рэдкалегію брыгаднай газэты.

Рэдкалегію трэба абраць на агульным сходзе калгасьнікаў. Для брыгадных газэт рэдкалегіі абіраюцца на сходзе брыгады.

Падбор кандыдатур у рэдкалегію—сур'ёзная справа. На самацёк спадзявацца тут ніяк нельга. Трэба добра абмеркаваць высунутыя кандыдатуры, каб у склад рэдкалегіі ня трапіў абы хто. У склад рэдкалегіі павінны быць абраны лепшыя з лепшых калгасьнікаў ударнікаў: селькоры, якія пішуць у раённы або цэнтральны друк.

Рэдкалегія можа быць абрана з трох або пяці чалавек, а можа быць абрана і з дзевяці і нават пятнаццаці чалавек.

Перавага рэдкалегіі ў складзе трох і пяці асоб тая, што можна хутчэй склікаць, хутчэй усім складам рэдкалегіі абмеркаваць тое ці іншае пытаньне. Перавага рэдкалегіі ў складзе дзевяці-пятнаццаці чалавек тая, што гэта рэдкалегія больш масавая. У работу рэдкалегіі ў складзе дзевяці-пятнаццаці асоб уцягваецца фактычна ўвесь актыў брыгады.

Бесьперабойны выхад газэты ў брыгадзе залежыць ад работы рэдкалегіі, ад расстаноўкі сіл унутры рэдкалегіі ад выразнага пляну работы. Увесь склад рэдкалегіі (9 — 15 чалавек) трэба падзяліць на зьменныя брыгады, прыкладна па тры чалавекі ў брыгаду. Рэдкалегія складае плян на пяцідзёнку або на дэкаду (можна і на цэлы месяц) і ў гэтым пляне прадугледжвае, што першы дзень насьценгазэту выпускае, скажам, зьменная брыгада т. Кавалёва, другі дзень—брыгада тав. Аронава, трэці—брыгада Івановай і г. д.

Апрача стварэньня зьменных брыгад, павінны быць абраны з ліку членаў рэдкалегіі адказны рэдактар і сэкратар. Рэдактар адказвае за пастаноўку ўсёй работы газэты і за работу зьменных брыгад. Сэкратар вядзе мастацкае афармленьне газэты, сочыць за рэагаваньнем на заметкі, вядзе ўлік заметак, улік селькораў, дзёньнік работы газэты і адказвае за архіў газэты.

Плян работы брыгаднай газэты складаецца на аснове вытворчага пляну брыгады. У складаньні пляну абавязкова прымае ўдзел сельпартарганізатар па друку.

Вопыт работы штодзённых калгасных газэт у часе леташняй пасеўнай кампаніі паказаў, што газэту лепш за ўсё падрыхтоўваць і афармляць увечары, пасьля работы брыгады. А раніцой газэта вывешваецца на відным месцы, там, дзе працуе брыгада (на вучастку, на стайні, у майстэрні і г. д.). Насьценгазэту трэба пісаць выразна, каб яе мог прачытаць і малапісьменны калгасьнік. Заметкі трэба пісаць кароткія, з канкрэтнымі фактамі жыцьця і работы сваёй вытворчай брыгады, або пра вопыт работы іншых брыгад свайго ці суседніх калгасаў. Трэба арганізоўваць і зьмяшчаць выклікі па сацыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі.

Неабходна арганізоўваць праз газэту грамадзкую праверку выкананьня сацдагавораў як паміж брыгадамі, так і паасобнымі калгасьнікамі.

Задача сельпарганізатара па друку—паставіць на належную вышыню рэагаваньне на зьмешчаныя допісы, разам з рэдактарам практыкаваць скліканьне нарад рэдкалегіі для абгаварэньня і крытыкі вышэйшых нумароў газэты, абгаварэньня далейшага пляну работы і г. д.

На нарады трэба запрошваць калгасьнікаў як сваёй, так і інш. брыгад. Парт'ячэйка павінна сыстэматычна склікаць нарады рэдактароў, членаў рэдкалегій, селькораў усяго калгасу або некалькіх калгасаў. На гэтых нарадах неабходна ставіць пытаньні гаспадарча-палітычнага значэньня.

(«Рабселькор»).

Ячэйка КП(б)Б, групком друкароў, рабочыя, ІТР, служачыя друкарні „Камінтэрн" з глыбокім жалем паведам яюць аб заўчаснай сьмерці 8 красавіка г. г., а 6 й гадзіне раніцы, пасьля цяжкай хваробы былога члена парт'ячэйкі і бюро, старога рабочага-наборшчыка

тав. ВЫДРЭВІЧА Моўшы Мэндзелевіча.

Вынас цела адбудзецца 10 красавіка, а 6 й гадзіне ўвечары з памяшканьня чырвонага кутку гарсавету.

Парт'ячэйка, праўленьне і мясцком арцелі інвалідаў імя 25 Кастрычніка з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці актыўнага працаўніка гарсабезу і старога члена партыі

тав. ВЫДРЭВІЧА,

якая пасьледвала 8 га красавіка 1933 г. пасьля цяжкай хваробы.

Віцебскі аддзел Беларускага аб'яднаньня глуханямых з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці інспэктара сабезу

тав. М. ВЫДРЭВІЧА

і выражае сваё спачуваньне сям'і памёршага.

11 га красавіка, а 6 гадзіне ўв чары, у Доме асьветы (Гогілеўская вул.) адчыняецца канфэрэнцыя па абгаварэньні мэтадаў выкладаньня ў ВНУ і тэхнікумах.

Абраныя дэлегаты атрымліваюць мандаты ў навучальнай частцы сваёй установы.

Яўка ўсіх навуковых работнікаў і выкладчыкаў тэхнікумаў абавязкова.

324-2-1 Бюро СПР.

11 га красавіка, а 6 гадзіне ўвечары, у Палацы працы (пакой № 20) адбудзецца нарада культсэктароў ФЗМК, МК і групкомаў па вельмі важных пытаньнях.

Яўка абавязкова.

325-2-1 Гарпрафсавет.

— 11 красавіка, а 6 й гадз. увечары, у памяшканьні гаркому КП(б)Б (пакой № 17), склікаецца НАРАДА СЭКРАТАРОЎ ПАРТ'ЯЧЭЕК, ДЫРЭКТАРОЎ, СТАРШЫНЬ ЗАВКОМАЎ (камуністаў), сэкратароў камсамольскіх ячэек цагельных зав даў 1, 2, 5, 13, вапняных заводаў „Вярхоўе" і „Руды", заводу блёчных каменьняў, п пытаньнях партмасавай работы і падрыхтоўкі да сэзону.

Пэрсанальна запрашаюцца тт.: ГАРЭЛІК, МОІН (гарсавет), СТАРОБІНЕЦ (ГК ЛКСМ), ЛЕВІНА (ГСПС). Гарком КП(б)Б.

13 красавіка, а 10 гадз. раніцы, у памяшканьні ГК КП(б)Б (пакой № 17) склікаецца НАРАДА СЭКРАТАРОЎ КАЛГАСНЫХ, САВГАСНЫХ І СЕЛЬСАВЕЦКІХ ЯЧЭЕК КП(б)Б І КСМ па пытаньні партмасавай і камсамольскай работы ў час сезу.

Яўка сэкратароў ячэек КП(б)Б і КСМ абавязкова.

ГК КП(б)Б. ГК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар Л. РОЗЭНБЛЮМ.

Замоўлен № 12. Друкарня „Камінтэрн", Віцебск, Ш. Тыраж 8.500 экз.